Вера Касап,
Таццяна Кузьмініч



# Праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў інфармацыйна-дакументнай сферы ў Беларусі

Сучасны ўзровень развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці патрабуе якаснай і вельмі мабільнай (арыентаванай на пастаянна зменлівую практыку) падрыхтоўкі спецыялістаў. Аб актуальнасці гэтай праблемы сведчаць, у прыватнасці, сумеснае пасяджэнне (люты 2003 г.) Бібліяграфічнага камітэта Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі (ББА) з супрацоўнікамі спецыяльных кафедр Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры (БДУ культуры) і арганізацыя секцыі па адукацыі ў межах канферэнцыі ББА (лістапад, 2003 г.). Гэта хвалюе і бібліятэкараў-практыкаў, і выкладчыкаў БДУ культуры, асабліва ва ўмовах рэарганізацыі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, якая адбылася ў маі 2003 г.

Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць з'яўляецца важнай часткай нацыянальна-культурнага развіцця грамадства. Яна арганічна ўваходзіць у сістэму інфармацыйна-дакументных камунікацый, выконвае ў ёй сваю адметную і надзвычай важную ролю, прычым не толькі ў назапашванні, апрацоўцы і давядзенні інфармацыі да карыстальнікаў, але і ў фарміраванні іх светапогляду, нацыянальнай свядомасці, мастацкага густу. Аб значнасці яе інтэнсіўнага развіцця для грамадства сведчыць прыняцце шэрага заканадаўчых актаў: «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб культуры ў Беларускай ССР», «Аб інфарматызацыі» і інш. Таму заканамерна, што пастаянна павышаюцца патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў.

У Рэспубліцы Беларусь склалася развітая сістэма нацыянальнай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, якая забяспечвае кваліфікаванымі кадрамі інфармацыйную дзейнасць не толькі бібліятэк, але і шэрага іншых грамадскіх інстытутаў сістэмы дакументных камунікацый. Тым не менш, інтэнсіўныя тэхналагічныя, сацыякультурныя і эканамічныя змены, якія адбываюцца ў краіне, патрабуюць удасканалення існуючай адукацыйнай сістэмы. Не выпадкова, што праблемы падрыхтоўкі кадраў хвалююць шырокае кола выкладчыкаў навучальных устаноў і бібліятэкараў-практыкаў. Па ініцыятыве Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі таксама робяцца захады па павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных кадраў і абмеркаванні перспектыў спецыяльнай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі.

У лютым 2003 г. адбылося сумеснае пасяджэнне Бібліяграфічнага камітэта ББА з супрацоўнікамі кафедр бібліяграфіі і дакументазнаўства, бібліятэказнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. У цэнтры ўвагі прысутных былі патрабаванні да бібліёграфа-практыка як адной з ключавых фігур інфармацыйна-дакументнай сферы.

Старшыня бібліяграфічнага камітэта ББА, загадчыца аддзела даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання НБ Беларусі Т.А.Яроха падкрэсліла важнасць якаснай і шматпланавай падрыхтоўкі бібліёграфа да практычнай дзейнасці. Яна адзначыла, што ва ўмовах ускладнення сацыяльна-культурнага асяроддзя, інтэнсіўнага пранікнення камп'ютэрных тэхналогій у дзейнасць бібліятэк актуалізуюцца тэхналагічныя, псіхалагічныя, культуралагічныя аспекты падрыхтоўкі кадраў. Была звернута таксама ўвага і на адставанне тэхналагічнай аснашчанасці факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм БДУ культуры ад патрабаванняў сучаснай грамадскай практыкі і ўзроўню, якога дасягнула бібліятэчна-бібліяграфічная справа ў Беларусі.

Член бібліяграфічнага камітэта ББА, загадчыца даведачна-інфармацыйнага аддзела ЦНБ НАН Беларусі С.М.Сітнік прапанавала сваё бачанне бібліёграфа сучаснасці. Выходзячы з патрабаванняў інтэнсіўна зменлівай практычнай дзейнасці, бібліёграф павінен быць адначасова аналітыкам і стваральнікам інфармацыйнай прадукцыі, экспертам і навігатарам сусветных інфармацыйных рэсурсаў, педагогам-псіхолагам, кансультантам, менеджэрам, тэхнолагам, перакладчыкам, даследчыкам, выкладчыкам інфармацыйнай культуры. Загадчыца аддзела даведачна-бібліяграфічнай работы РНТБ Н.В. Несцяронак адзначыла, што ўзровень спецыялістаў, якіх рыхтуе факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм БДУ культуры, значна павысіўся. Яны здольны выконваць як традыцыйныя, апрабіраваныя шматгадовай практыкай абавязкі бібліёграфа, так і якасна новыя, звязаныя з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій. Удзельнікі пасяджэння выказалі меркаванне, што разам з універсальнасцю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі бібліёграфа неабходна надаваць пільную ўвагу падрыхтоўцы выпускнікоў у межах асобных спецыялізацый. Загадчыца бібліяграфічнага аддзела ЦБ ЦДБС г. Мінска Т.А. Кенька звярнула ўвагу на недахопы пры размеркаванні студэнтаў на вытворчую практыку (часам без уліку спецыялізацыі і жадання студэнтаў) і цяжкасці замацавання кадраў у дзіцячых бібліятэках.

У ходзе сустрэчы была выказана занепакоенасць працэсам падрыхтоўкі кадраў і з боку выкладчыкаў факультэта. Гэта было звязана найперш з пераходам на двухузроўневую сістэму навучання і з распрацоўкай новых адукацыйных стандартаў. Загадчык кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства прафесар В.Е. Лявончыкаў пазнаёміў прысутных са спецыфікай выкладання бібліяграфічных дысцыплін у сучасных умовах і акрэсліў праблемы прафіліравання пры падрыхтоўцы бакалаўраў і магістраў. Была звернута ўвага на важнасць цеснага супрацоўніцтва паміж выкладчыкамі факультэта і бібліёграфамі-практыкамі ў распрацоўцы праблем бібліяграфазнаўства. Як адзін са шляхоў рэалізацыі гэтага можа стаць, на думку В.Е. Лявончыкава, стварэнне сектара бібліяграфазнаўства ў НБ Беларусі.

Дацэнт кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства С.В. Зыгмантовіч звярнула ўвагу на неабходнасць сумеснай з бібліёграфамі-практыкамі распрацоўкі комплексных навуковых тэм, а таксама мэтазгоднасць павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў на базах буйнейшых бібліятэк Беларусі. Было выказана пажаданне больш актыўна і аператыўна адлюстроўваць вынікі бібліяграфічнай практычнай дзейнасці на старонках прафесійнага друку, што з'явілася б добрым падмуркам для выкладання адпаведных вучэбных дысцыплін, напісання студэнтамі курсавых і дыпломных работ.

На чарговай канферэнцыі ББА (лістапад 2003 г.) былі таксама ўзняты надзвычай актуальныя для сучаснай грамадскай практыкі праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў. Была арганізавана спецыяльная секцыя па праблемах адукацыі. У выступленнях дэкана факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры М.А. Яцэвіча, дэкана факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУ культуры Н.В. Алянюк, намесніка дырэктара Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага тэхнікума Л.Ф. Платоненка, а таксама выкладчыкаў факультэта і супрацоўнікаў бібліятэк абмяркоўваліся пытанні розных узроўняў адукацыі, была звернута ўвага на неабходнасць пашырэння профілю падрыхтоўкі спецыялістаў, укаранення інфармацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс, мэтазгоднасць увядзення новых спецыяльнасцей і спецыялізацый.

Як бачна, і бібліятэкараў-практыкаў, і выкладчыкаў бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін непакоіць сучасны стан і будучыня бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі. Тым не менш, гэтыя праблемы не знайшлі шырокага адлюстравання ў айчынным прафесійным друку. Іх абмеркаванне паспрыяе стварэнню мадэлі прафесійнай дзейнасці ў цэлым, мадэлі спецыяліста і мадэлі яго падрыхтоўкі ў сістэме прафесійнай адукацыі.



Падрыхтоўка кадраў для інфармацыйна-дакументнай (у тым ліку і для бібліятэчна-бібліяграфічнай) дзейнасці павінна ўключаць прафарыентацыйную работу, сярэднеспецыяльны і вышэйшы адукацыйныя ўзроўні, сістэму павышэння кваліфікацыі.

Прафарыентацыйная работа можа здзяйсняцца праз выступленні выкладчыкаў у сярэдніх навучальных установах, бібліятэках, цэнтрах занятасці насельніцтва, а таксама шляхам заключэння дагавораў аб адкрыцці прафіліраваных ліцэйскіх класаў на базе школ і гімназій гуманітарнага кірунку, вучэбна-вытворчых камбінатаў.

Сярэднеспецыяльны ўзровень прадугледжвае мэтанакіраваную падрыхтоўку кадраў для практычнай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Мэтазгодна прадоўжыць і пашырыць практыку стварэння вучэбных комплексаў непарыўнай спецыяльнай адукацыі – «сярэднеспецыяльная ўстанова – вышэйшая ўстанова». На базе Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума і Мінскага вучэбна-лінгвістычнага комплексу гімназія-каледж №24 яна ўжо рэалізавана. Гэты вопыт можа быць распаўсюджаны і на Гродненскі дзяржаўны каледж мастацтваў. Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі здзяйсняецца ў БДУ культуры, а таксама робяцца захады па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў межах няпрофільных ВНУ. У Беларусі развіваецца таксама сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. Развіццё гэтых устаноў ідзе ў кірунку шматфункцыянальнасці і шматпрофільнасці з паляпшэннем сувязей з бібліятэкамі, кнігагандлёвымі ўстановамі, органамі дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў, інфармацыйнымі цэнтрамі і да т.п. У цэлым сістэма забяспечвае права грамадзян Рэспублікі Беларусь на бясплатнасць і даступнасць сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Здзяйсняецца таксама падрыхтоўка спецыялістаў на аснове дагавораў з установамі культуры і на платнай аснове. Назіраюцца станоўчыя тэндэнцыі ў працаўладкаванні выпускнікоў. Спецыялісты з бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыяй запатрабаваны не толькі бібліятэкамі, але і кніжнай палатай, органамі навуковай інфармацыі, выдавецкімі і кнігагандлёвымі ўстановамі, архівамі і іншымі грамадскімі інстытутамі сістэмы дакументных камунікацый, у межах якіх здзяйсняецца кумуляцыя, перапрацоўка і распаўсюджванне дакументаванай інфармацыі. Веды, уменні і навыкі, сфарміраваныя ў працэсе навучання, дазваляюць ім працаваць з рознымі відамі інфармацыйных рэсурсаў грамадства і з рознымі катэгорыямі карыстальнікаў. Таму сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай падрыхтоўкі спецыялістаў павінна, на нашу думку, заняць адпаведную адукацыйную нішу і мець у перспектыве рэальны інфармацыйна-дакументны змест.

Інтэнсіўнае развіццё інфармацыйна-дакументных камунікацый і пашырэнне сферы дзейнасці адпаведных грамадскіх інстытутаў прыводзіць да частковай незабяспечанасці іх высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Неабходна звярнуць увагу і на ўзмацненне псіхолага-педагагічнай і культуралагічнай падрыхтаванасці спецыялістаў сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый. Гэта надзвычай важна ва ўмовах тэхналагізацыі розных сфер грамадскага жыцця, калі актуалізуецца захаванне гуманістычных каштоўнасцей.

Удасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў павінна абапірацца на айчынны і замежны вопыт адпаведных адукацыйных структур і садзейнічаць павышэнню прэстыжу прафесіі, фарміраванню адкрытай самаразвіваючай сістэмы, якая зможа забяспечыць высокі ўзровень прафесійнай кваліфікацыі і адэкватна ўлічваць патрабаванні рынку працы, інтэлектуальныя і матэрыяльныя патрэбнасці асобы. Для дасягнення гэтага мэтазгодна:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– удасканаленне сістэмы навучання і выхавання спецыялістаў у галіне інфармацыйна-дакументных камунікацый, якая будзе адпавядаць новаму этапу развіцця грамадства;

– стварэнне эфектыўных механізмаў узаемадзеяння адукацыйнай сістэмы са сферай інфармацыйна-дакументных камунікацый;

– забеспячэнне аператыўнага рэагавання на патрэбнасці інфармацыйнага рынку і рынку працы;

– пашырэнне магчымасцей атрымліваць адукацыю і кваліфікацыю ў адпаведнасці з індывідуальнымі схільнасцямі асобы, запатрабаваннямі грамадства ў цэлым і інфармацыйна-дакументнай сферы ў прыватнасці і інш.

На наш погляд, асноўным звяном падрыхтоўкі кадраў у сучасных умовах з'яўляецца ВНУ. Атрыманне вышэйшай інфармацыйна-дакументнай адукацыі магчыма праз дзённую, завочную і дыстанцыйную формы навучання. Калі першыя дзве даўно ўжо апрабаваны і маюць сталыя традыцыі, то дыстанцыйная форма навучання пакуль што не атрымала распаўсюджання і бачыцца як адна з перспектыўных у сучасных умовах інтэнсіўнага пранікнення інфармацыйных тэхналогій у розныя сферы грамадскай практыкі. Для яе ўкаранення і эфектыўнага выкарыстання мэтазгодна распрацоўка спецыяльных вучэбных планаў, праграм, графікаў вучэбнага працэсу, змястоўнага напаўнення курсаў.

У сувязі з уключанасцю інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці ў розныя грамадскія інстытуты інфармацыйна-дакументных камунікацый неабходны змены і ў профілі падрыхтоўкі кадраў. Вышэйшая спецыяльная адукацыя павінна забяспечыць не толькі бібліятэчную справу, але і адпаведныя кірункі рэдакцыйна-выдавецкай, кнігагандлёвай, улікова-рэгістрацыйнай, дакументнай і навукова-інфармацыйнай сфер, а таксама аналітыка-інфармацыйных відаў дзейнасці, распаўсюджаных у іншых галінах грамадскай практыкі. У маі 2003 г. змянілася назва факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм БДУ культуры на факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый. Адбылося рэфармаванне структуры факультэта: былі створаны кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, інфармацыйных рэсурсаў.

Нам бачыцца мэтазгодным пашырэнне спектра падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй праз увядзенне дзвюх спецыяльнасцей: «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «менеджмент інфармацыйна-дакументнай сферы» (на сённяшні дзень існуе толькі адна – «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»).

У межах спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» магчыма фарміраванне наступных спецыялізацый:

– бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура;

– бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова;

– інфармацыйнае забеспячэнне сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага, медыцынскага комплексаў;

– культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк;

– старадрукаваная і рэдкая кніга;

– педагогіка і псіхалогія дзіцячага чытання;

– кампенсаторна-бібліятэрапеўтычная дзейнасць;

– кансервацыя і рэстаўрацыя дакументаў;

– фарміраванне і выкарыстанне нацыянальных краязнаўчых рэсурсаў;



– рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць бібліятэк;

– інфармацыйныя сістэмы ў сферы дакументных камунікацый;

– мультымедыйныя тэхналогіі і WEB-дызайн у інфармацыйна-дакументнай сферы.

У межах спецыяльнасці «менеджмент інфармацыйна-дакументнай сферы» мэтазгодна ўвядзенне наступных спецыялізацый:

– менеджмент бібліятэчных сістэм;

– маркетынг бібліятэчнай справы;

– менеджмент электронных інфармацыйных рэсурсаў;

– сацыялогія і псіхалогія бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

– дакументацыйнае забеспячэнне адміністрацыйна-кіруючай дзейнасці;

– кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю;

– інфармацыйны аналіз і кансалтынг;

– камерцыйная дзейнасць у інфармацыйна-дакументнай сферы;

– рэклама ў інфармацыйна-дакументнай дзейнасці;

– адміністрыраванне ў інфармацыйных сістэмах.

Зразумела, гэта даволі шырокі пералік спецыялізацый, увядзенне якіх магчыма паэтапна. Будзе вельмі добра, калі на старонках спецыяльнага друку адбудзецца зацікаўленае яго абмеркаванне і ўдакладненне.

Вырашэнне задач, скіраваных на трансфармацыю бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі ў інфармацыйна-дакументную, прадугледжвае павелічэнне аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання. Неабходна таксама стварэнне ўмоў для прыцягнення дадатковых інвестыцый у мэтах рэалізацыі правоў грамадзян на атрыманне бясплатнай адукацыі і інтэнсіўнае развіццё навучальных устаноў. Патрабуе ўдасканалення сістэма забеспячэння вучэбнага працэсу вучэбна-метадычнай, даведачнай літаратурай, друкаванымі і электроннымі бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі матэрыяламі. Неабходна пашырэнне выдавецкай дзейнасці навучальных устаноў (выданне навуковых, вучэбна-метадычных, даведачных матэрыялаў, аўдыёвізуальных і камп'ютэрных прадуктаў) і ўдасканаленне сістэмы яе продажы і падаткаабкладання. Сучасны ўзровень падрыхтоўкі кадраў для інфармацыйна-дакументнай сферы актуалізуе задачу стварэння на адпаведным факультэце БДУ культуры інфармацыйнага цэнтра, абсталяванне кафедр і лабараторый сучаснай камп'ютэрнай тэхнікай, набыццё настольных паліграфічных комплексаў, пераабсталяванне спецыяльных лабараторый сучаснай мэбляй і інш.

Бясспрэчна, што інтэнсіўнае развіццё інфармацыйных тэхналогій і інфармацыйных рэсурсаў патрабуе падрыхтоўкі спецыялістаў, якія не толькі валодаюць пэўнай сукупнасцю агульнаадукацыйных і прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, але і здольны хутка рэагаваць на змены ў рэчаіснасці, папаўняць і паглыбляць свае веды, пастаянна павышаць свой тэарэтычны і прафесійны ўзровень, актыўна ўдзельнічаць у працэсе ўдасканалення грамадскай практыкі. А якімі ведамі, уменнямі і навыкамі будзе валодаць малады спецыяліст сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый залежыць як ад мабільнасці сістэмы падрыхтоўкі кадраў, так і актыўнага ўдзелу ў ёй бібліятэкараў-практыкаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ